ПАЛАЖЭННЕ

аб правядзенні раённага літаратурнага конкурсу “Дэбют-2026”

(далей - Палажэнне)

**ТЭМЫ:**

**1. “Что значит быть патриотом сегодня”** – аб патрыятызме, павазе да сваёй Радзімы

**2. “Белорусская женщина глазами молодежи”-** прысвечана Году беларускай жанчыны

**3. “Любовь-она бывает разной, или такая разная любовь……” –** вольная тэма.

**Мэты і задачы.**

1. Выхоўваць пачуццё патрыятызму ў сучаснікаў, пачуццё любові да Радзімы, да малай радзімы, да яе гістарычнай спадчыны.

2. Звярнуць увагу грамадства на неабходнасць выхавання асноўных маральных якасцей і агульначалавечых каштоўнасцей.

3. Выхоўваць цікавасць і любоў да роднай мовы, да літаратурнай спадчыны беларускага народа.

4. Садзейнічаць выяўленню, развіццю і рэалізацыі творчага патэнцыялу, літаратурна-мастацкіх здольнасцей грамадзян.

**I. Арганізатары конкурсу.**

Упраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, упраўленне па адукацыі адміністрацыі Першамайскага раёна г.Мінска, ДУ “Нацыянальная бібліятэка Беларусі”:

- забяспечваюць інфармацыйную падтрымку конкурсу;
- рэгіструюць конкурсныя творы;
- зацвярджаюць прафесійнае журы;
- кантралююць выкананне Палажэння.

**II. Тэрмін правядзення конкурсу.**

Конкурс праводзіцца **з 27 кастрычніка па 17 лістапада 2026 года.**

Адборачны тур праводзіцца **з 22 лістапада па 27 лістапада 2026 года.**

Падвядзенне вынікаў – **27 лістапада 2026 года**.

**III. Парадак і ўмовы правядзення конкурсу.**

1. У конкурсе прымаюць удзел усе жадаючыя ва ўзросце ад 14 гадоў і старэйшыя.

2. Конкурсны матэрыял павінен прадстаўляць сабой работу, напісаную спецыяльна для ўдзелу ў конкурсе і ніколі раней не друкаваную.

3. Неабходна строга выконваць зададзеную тэму.

4. Конкурсныя матэрыялы (6 экзэмпляраў) прадстаўляюцца на рускай альбо беларускай мовах у друкаваным выглядзе (на аркушах фармату А4, 1,5 інтэрвалам, шрыфтам 14 Times New Roman) **да 17 лістапада 2026 года** ў адміністрацыю Першамайскага раёна г.Мінска (220012, г.Мінск, завулак Кузьмы Чорнага, 5, каб. № 313; тэл. +375 17 303 92 56, +375 17 215 24 63).

5. Жанры конкурсных твораў – апавяданне, нарыс, верш, эсэ, п’еса.

6. Дапускаецца арыгінальнае аўтарскае вызначэнне жанру.

7. Агульны аб’ём твораў не павінен перавышаць 3 (трох) друкаваных аркушаў фармату А4.

8. Тытульны ліст (у аб’ём творчай працы не ўваходзіць) павінен уключаць звесткі пра аўтара: прозвішча, імя і імя па бацьку, узрост (дата нараджэння і колькасць поўных гадоў), месца вучобы (клас, нумар групы) або месца працы (пасада), гурток альбо студыя (калі займаецеся дадаткова ў літаратурным гуртку альбо студыі), паштовы адрас, кантактны тэлефон, электронны адрас, а таксама намінацыя, назва твора.

9. Творы павінны быць надрукаваныя на адным баку аркуша фармату А4.

10. Удзельнік конкурсу гарантуе, што ён з’яўляецца аўтарам пададзеных літаратурных твораў і не парушае нічыіх аўтарскіх правоў.

Конкурсная праца не павінна з’яўляцца плагіятам, копіяй або часткай работ іншых аўтараў.

11. Творы, пададзеныя на конкурс, аўтарам не вяртаюцца.

12. Работы, прадстаўленыя на конкурс з парушэннем тэрмінаў ці патрабаванняў да тэматыкі, да ўдзелу не дапускаюцца.

Не прымаюцца таксама да разгляду творы:

- выкананыя з парушэннем вышэйпералічаных патрабаванняў;
- прадстаўленыя на конкурс паўторна;
- з парушэннем этычных нормаў.

13. Вынікі конкурсу будуць размяшчацца на афіцыйным сайце адміністрацыі Першамайскага раёна г.Мінска, Facebook, Telegram. Instagram.

14. Правы на выкарыстанне конкурсных твораў належаць аўтарам.

15. Ананімныя творы, а таксама творы, дасланыя трэцімі асобамі, не разглядаюцца.

16. Падача заяўкі на ўдзел у конкурсе азначае прыняцце правілаў дадзенага Палажэння.

## IV. Крытэрыі ацэнкі конкурсных матэрыялаў.

- Адпаведнасць тэме конкурсу і абранай намінацыі;
- агульнае чытацкае ўспрыманне;
- арыгінальнасць і індывідуальны творчы падыход;
- мастацкі густ і выразнасць;
- паслядоўнасць і арыгінальнасць выкладу;
- адлюстраванне асабістай пазіцыі.

Вітаецца наяўнасць ілюстрацыйнага матэрыялу, які дапаўняе тэму.

## V. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне пераможцаў.

Вынікі конкурсу падводзяцца па ўзроставых катэгорыях:

ад 14 гадоў да 19 гадоў;
ад 20 гадоў да 30 гадоў;
ад 31 года і старэйшых за.

**I этап –** падвядзенне вынікаў і заахвочванне на месцах (установы адукацыі, установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, прамысловыя прадпрыемствы, арганізацыі раёна, вайсковыя часткі і інш).

**II этап –** ацэнка раённым журы лепшых твораў, вызначэнне прызавых месцаў у кожным конкурсным жанры і ў кожнай узроставай групе.

Пераможцы раённага конкурсу ўзнагароджваюцца граматамі альбо дыпломамі, памятнымі прызамі.

Лепшыя творы, пры згодзе галоўнага рэдактара, могуць быць надрукаваны ў рэспубліканскіх часопісах і газетах.

Вынікі конкурсу не аспрэчваюцца і перагляду не падлягаюць.

Па рашэнні журы могуць уручацца дыпломы альбо граматы іншым удзельнікам конкурсу.

## VI. Арганізацыйны камітэт.

**Фёдарава В.Ю.** – старшыня арганізацыйнага камітэта, намеснік кіраўніка адміністрацыі Першамайскага раёна г.Мінска;

**Клімовіч А.У.** – намеснік начальніка упраўлення па адукацыі адміністрацыі Першамайскага раёна г.Мінска;

**Кавалёва Л.Р.** – намеснік начальніка ўпраўлення – загадчык сектарам культуры ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі адміністрацыі Першамайскага раёна г.Мінска;

**Гігін В.Ф**. - генеральны дырэктар ДУ “Нацыянальная бібліятэка Беларусі”;

**Пакусаева Л.В.** – старшыня Першамайскай раённай арганізацыі г.Мінска ГА» БСЖ".

## VII. Журы конкурсу.

Фарміруецца арганізатарамі.

Разглядае прадстаўленыя творы і вызначае пераможцаў.

Гарантуе максімальную аб’ектыўнасць пры вызначэнні пераможцаў.

Не ўступае ў дыскусіі з удзельнікамі конкурсу.

Рашэнне журы з’яўляецца канчатковым.